

# ВАСІЛЬ ЯФІМАВІЧ БРАІМ

Васіль Яфімавіч Браім – заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, саліст і член мастацкага савета Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», член Беларускага саюза музычных дзеячаў, чыё імя занесена ў Галерэю Славы гэтай творчай грамадскай арганізацыі, уладальнік Ганаровага знака Беларускага прафсаюза працаўнікоў культуры, інфармацыі, спорту і турызму і юбілейнага знака «Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі: 100 гадоў прафсаюзнаму руху».

Нарадзіўся будучы вядомы спявак 20 ліпеня 1954 г. у вёсцы Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Бацькі яго былі звычайнымі сялянамі, але сям'я любіла музыку, песню, і ў хаце часта можна было пачуць спевы. Спявалі таксама і ў вёсцы: на працы, збіраючы збожжа, на сенакосе, калі таўклі проса, на святах, калядуючы, сустракаючы вясну, пускаючы вянкі па вадзе, спраўляючы вяселлі, ходзячы ў адведкі, хаваючы нябожчыка. Як успамінае Васіль Яфімавіч, дома ў хаце спяваў ён рэдка, у асноўным, калі не было бацькоў, бо сароме́ўся. Але калі выпадала пайсці ў лес, тут хлапчук сябе не стрымліваў, адводзіў душу, як кажуць, «па поўнай».

Пасля заканчэння Ляскавіцкай сярэдняй школы ў 1970 г. Васіль працаваў настаўнікам працоўнага навучання і лабарантам у Ленінскай сярэдняй школе Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Потым у 1972 – 1974 гг. служыў у войску, пасля паступіў на эканамічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта (цяпер Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны), скончыўшы які працаваў на інжынерных пасадах завода «Зеніт» у Вілейцы (цяпер ААТ «Зеніт-БелОМА») і завода ліцця і нармаляў ВА «Гомсельмаш» у Гомелі. Увесь гэты час Васіль Браім прымаў актыўны ўдзел у мастацкай самадзейнасці, дзе атрымліваў на розных аглядах і конкурсах заахвочванні. Пасля чарговай перамогі ён быў запрошаны працаваць у камерны хор Гомельскай абласной філармоніі, дзе з траўня 1984 г. па кастрычнік 1986 г. спяваў, нават не меўшы яшчэ грунтоўнай прафесійнай музычнай адукацыі.

З кастрычніка 1986 г. Васіль Яфімавіч Браім быў прыняты на пасаду артыста хору ў Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, дзе і працуе па цяперашні час. Паралельна з працай у славутым калектыве ён у 1990 г. скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя М. І. Глінкі па спецыяльнасці «харавое дырыжыраванне» (клас выкладчыка В. І. Шэвандронава), а ў 1994 г. Расійскую акадэмію музыкі імя Гнесіных па спецыяльнасці «сольныя народныя спевы» (клас народнай артысткі СССР, лаурэата Дзяржаўнай прэміі імя М. І. Глінкі, прафесара Н. К. Мяшко). За ўсю гісторыю існавання Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча В. Я. Браім з'яўляецца адзіным выпускніком гэтай прэстыжнай вышэйшай музычнай навучальнай установы. Прыродны музычны талент, грунтоўныя прафесійныя веды, багата назапашаны вопыт, сур'ёзнае і добрасумленнае стаўленне да сваёй прафесіі дазволілі спеваку заняць вядучае месца ў хоры.

Васіль Яфімавіч Браім – артыст рэдкага натуральнага вакальнага таленту. У яго голасе ўвабраны лепшыя рысы і адценні палескага народна-песеннага стылю, што не перашкаджае яму вывучаць і дэманстраваць іншыя рэгіянальныя стылістычныя асаблівасці выканання беларускага фальклору. Тэнар спевака адрозніваецца шырокім дыяпазонам і завіднай трываласцю, ва ўсіх рэгістрах ён гучыць лёгка, роўна, здзіўляючы яскравай тэмбральнай прыгажосцю. Гэтыя тэхнічныя якасці голасу В. Я. Браіма дазваляюць яму з поспехам выконваць не толькі народныя песні, але па-майстэрску спраўляцца з любымі сольнымі партыямі ў аўтарскіх творах, якія напісаны для голасу з народнай манерай спеву. Спявак свабодна і артыстычна валодае сцэнай, яго эмацыянальная і выразная інтэрпрэтацыя вакальнага матэрыялу нікога не пакідае абыякавым, знаходзячы водгук у сэрцах шматлікіх прыхільнікаў.

Васіль Яфімавіч Браім неаднаразова прымаў удзел у разнастайных рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях і конкурсах, дзе станавіўся пераможцам у складзе калектыву хору. Сярод найбольш значных музычных форумаў значацца Міжнародны фестываль мастацтваў «Красавіцкая вясна» (Паўночная Карэя, Пхеньян, 1989), Дні культуры СССР у ГДР (Берлін, Патсдам, Расток, 1989), Дні культуры Рэспублікі Беларусь у КНР (Пекін, 1999, 2008), міжнародныя фальклорныя фестывалі ў Фінляндыі (1993), Італіі (1992, 1993), Германіі (1995), Польшчы (1998, 1999, 2008), Францыі (2000), Швейцарыі, Бельгіі (2008), Расіі (2012). В. Я. Браім саліраваў у канцэртах Народнага хору імя Г. І. Цітовіча, якія праходзілі ў рамках фестываляў і конкурсаў «Славянскі Базар у Віцебску», «Сожскі карагод» у Гомелі, «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах, «Дняпроўскія галасы» ў Дуброўне, «Магутны Божа» ў Магілёве, «Фестываль нацыянальных культур» у Гродне, «Беларуская музычная вясна» і «Беларуская музычная восень» у Мінску. Акрамя канцэртнай дзейнасці спявак прымаў удзел як член журы ў працы некаторых творчых спаборніцтваў: VI адкрытыя моладзевыя Дэльфійскія гульні дзяржаў-удзельніц СНД (Арменія, Ерэван, 2010), Рэспубліканскі конкурс маладых талентаў «Зорка ўзышла над Беларуссю» (Мінск, 2010), Рэспубліканскі фестываль-конкурс маладых выканаўцаў беларускай народнай песні «Галасы Радзімы» (Мінск, 2002, 2004).

Тонка адчуваючы мастацкую прыроду фальклору, свабодна валодаючы вакальнай тэхнікай, Васіль Яфімавіч Браім аднолькава паспяхова выконвае як лірычныя, так і патрыятычныя творы, балады, рамансы, прыпеўкі. За шматгадовую працу ў Народным хоры імя Г. І. Цітовіча ён спяваў песні на розных мовах. Сярод найбольш знаных яго кампазіцый: «Па садочку хаджу», «І туды гара і сюды гара», «Ой, на горэ дожджык мрачэ», «Чэрэз сэнэчка да воротэчка», «Із-за лесу гаю», «Радзіма мая дарагая», «Карабейнікі», «Калінка», «Ночка, ночка» ды інш.

Творчыя праграмы з удзелам спевака запісаны на Беларускім тэлебачанні і радыё, грампласцінках і кампакт-дысках. У актыве артыста ёсць і праца ў кіно. Цікава і самабытна ім сыграна роль Свата ў фільме-канцэрце «Палескія вяселлі» (Беларусьфільм, творчае аб'яднанне «Летапіс», 1986).

Васіль Яфімавіч Браім не толькі займаецца сольнай вакальнай кар'ерай, шмат гадоў аддаў педагагічнай працы. Ён падрыхтаваў вялікую колькасць спецыялістаў у галіне вакальнага народнага мастацтва. Сярод яго выхаванцаў такія вядомыя ў Беларусі музыканты, як Таццяна Бейма, Кацярына Булатоўская, Мікалай Кірычэнка, Вольга Куксік, Таццяна Лазоўская, Вольга Ліннік, Сяргей Мядзведзеў, Андрэй Макарчук, Вячаслаў Нагорны, Вераніка Раманенкава, Паліна Смолава, Святлана Суседчык, Аляксандр Сабалеўскі. Былыя студэнты класа В. Я. Браіма працуюць у вядомых вакальных і харавых калектывах не толькі па ўсёй Беларусі, але і ў Расіі.

Васіль Яфімавіч Браім аказвае дапамогу і маладым артыстам, якія пачынаюць свой творчы шлях у Народным хоры імя Г. І. Цітовіча, у іх станаўленні, павышэнні выканальніцкага ўзроўню салістаў калектыву і дасягненні вяршынь вакальнага майстэрства. Пры неабходнасці ён аказвае метадычную дапамогу і кансультуе салістаў-вакалістаў іншых самадзейных і прафесійных ансамбляў і хораў. Сваёй адданасцю музыцы і песне, бескарысным служэннем мастацтву спявак падае выдатны прыклад маладым выканаўцам.

*А. Ю. Валодчанка,*
*старшы выкладчык кафедры*
*народна-песеннай творчасці і фальклору*
*УА «БДУКМ», магістр мастацтваў*